У. А. ЖЫЛКО

# ТЭАТР ТЫШКЕВІЧАЎ У СВІСЛАЧЫ ЯК КУЛЬТУРНЫ АСЯРОДАК КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XIX ст. / TIŠKEVIČIŲ TEATRO Į SVISLOCH KAIP KULTŪINĖ APLINKA XVIII–XIX a.

U. ZHYLKO

# TYSHKEVICH THEATRE IN SVISLACH AS CULTURAL ENVIRONMENT IN THE END OF XVIII – EARLY XIX CENTURIES

*The text is devoted to Tyshkevich's private theater as a cultural center of Svislach late XVIII – early XIX century. The author dwells on the history of the theater of Vincent Tyshkevich. Attention is drawn to the fact that then the place Svislach performed while a major cultural and educational center, which was visited by distinguished persons famous theatrical and musical groups from The author relied on the memoirs memories L. Patotski. In describing the theater's repertoire, holiday fairs and the features of the leisure activities. Emphasizes that the private theaters were the important part of the general development of culture of Belarus.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Многія прадстаўнікі беларускай магнатэрыі (Радзівілы, Сапегі, Тызенгаўзы і інш.) стваралі ў сваіх маёнтках тэатры, капэлы, аркестры, а нярэдка і самі станавіліся кампазітарамі і музыкантамі. Іх дзейнасць стымулявала тагачаснае развіццё музыкі і мастацтва. Між іх вядомым асяродкам культурнага жыцця Беларусі канца XVIII – пачатку XIX ст. быў тэатр у Свіслачы, заснаваны ўладальнікам мястэчка Вінцэнтам Тышкевічам.

На той час Свіслач перажывала перыяд эканамічнага і культурнага развіцця: мястэчка было даволі значным прамысловым, гандлёвым і культурна-асветным цэнтрам. Увогуле гістарычны вопыт развіцця беларускіх мястэчак, гэтых пераходных паміж вёскай і горадам утварэнняў, якія стагоддзямі паказвалі прыклад гарманічнага суіснавання прадстаўнікоў розных этнасаў на адной сацыякультурнай і эканамічнай прасторы, спрыяў выкрышталізоўванню своеасаблівага местачковага побыту, адпаведнай культуры, якая ў многім вылучала тагачасную беларускую сацыякультурную сітуацыю. Адной з найбольш прыкметных адметнасцей якраз былі прыватныя тэатры.

Паводле сучасніка магната, мемуарыста Л. Патоцкага, сама ідэя заснавання тэатра ў Свіслачы належыць жонцы рэферэндара В. Тышкевіча Марыі Тэрэзе – пляменніцы апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага: *«Пані*

*рэферэндарыня Тышкевіч у час свайго нядоўгага побыту ў Свіслачы была арганізавала прыгожы і элегантны тэатрык, у якім з падабранай групай аматараў разыгрывала французскія п'есы. Народная ж мова, у тую эпоху выгнаная з модных салонаў, захоўвалася толькі па шляхецкіх дамах. Адчыніў ёй свае дзверы нанова муж, пакінуты жонкаю, бо тая, ад'язджаючы ад яго, забрала з сабою тое, што было моднае, чужое, нясвойскае. Пазней гэта самая тэатральная зала была прызначана для кірмашовых драматычных артыстаў»* [2].

Асобны будынак для тэатра быў узведзены ў межах маёнткавага комплексу ў пачатку 1800-х гг. Ён уяўляў сабой аднапавярховае драўлянае збудаванне пад гонтавым дахам. У ім знаходзілася вялікая тэатральная і дзве танцавальныя залы, чатыры артыстычныя прыбіральні, агульная прыхожая і кухня. Будынак праіснаваў да 20-х гг. ХХ ст.

Тэатральнае і музычнае жыццё мястэчак, у тым ліку Свіслачы, станавілася прыкметна актыўным падчас кірмашоў, якія звычайна пачыналіся ўлетку 15 жніўня. Апрача непасрэдна гандлёвай, кірмашы выконвалі і культурную функцыю: адыгрывалі вялікую ролю ў грамадскім і духоўным жыцці мястэчак [5, с. 59]. На штогадовы свіслацкі кірмаш з'язджаліся купцы з многіх еўрапейскіх краін, шматлікія госці і выбітныя прадстаўнікі беларускай магнатэрыі (Радзівілы, Сапегі, Валовічы, Ельскія, Булгарыны, Палубінскія, Патоцкія і інш.). Падчас кірмашоў змяняўся ўвесь жыццёвы ўклад Свіслачы, максімальна актывізавалася культурнае жыццё мястэчка. Кірмашы сталі адмысловым агульнагарадскім святам з адмысловай культурнай праграмай, у якую ўваходзілі балі, маскарады, наведванне тэатра, звярынца, плаванне на чаўнах і інш. На ўсе забавы ўваход для публікі быў вольным. У межах кірмашоў праводзіліся танцавальныя вечарыны, прафесійныя і народныя тэатральныя прадстаўленні, выступленні ансамбляў музыкаў і цыркавых артыстаў. Вось як апісвае свіслацкі кірмаш Л. Патоцкі: *«Кірмаш быў важнай падзеяй, якую з найвялікшай нецярплівасцю чакалі гандляры, маладыя і старыя. Першыя спадзяваліся на ім шмат утаргаваць, другія – натанцавацца даскочу, трэція – нагаварыцца. Нічога так не нагадвала замежныя воды, як свіслацкі кірмаш. Той вялікі збор грамадзян, што жылі ў асобных дворыках, адведвалі адзін аднаго, рабілі прагулкі конна, пешшу, у павозках, якія штодня*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*збіраліся*
*ў двор на абеды, на балі, на публічныя маскарады, у тэатр»* [2].

У свіслацкім тэатры былі акцёры-аматары, прыгонныя музыканты і танцоры, а таксама навучэнцы знакамітай Свіслацкай гімназіі. Польскі даследчык А. Мілер адзначае: «Былі ў Свіслачы здольныя артысты, музыканты, танцоры, ставіліся балеты і музычныя сцэны. Не раз артысты першага разраду, праязджаючы праз Свіслач, выступалі на сцэне са сваімі талентамі» [7, с. 50–51]. Нягледзячы на тое, што ўваход у тэатр быў вольны, прыгонныя сяляне яго не наведвалі, бо музыка і мова, пераважна французская, для іх былі незразумелыя. Гледачамі тэатра былі пераважна шматлікія госці графа.

Прыдворны тэатр існаваў за кошт і на патрэбу сваіх уладальнікаў, ад якіх цалкам залежаў рэпертуар, яго мастацкі ўзровень, а антрэпрыза працавала на публіку і кіравалася яе густам і камерцыйнымі патрэбамі. Гэта стварала ўмовы для фарміравання прынцыпова новай тэатральнай культуры і новай драматургіі. Як і ўсе музычныя тэатры Беларусі таго перыяду, тэатр у Свіслачы быў арыентаваны на заходнееўрапейскі рэпертуар. Тагачасныя вышэйшыя колы грамадства аддавалі перавагу менавіта заходнееўрапейскай культуры. Магнацкія рэзідэнцыі, якія славіліся сваёй раскошай, бралі за ўзор Версаль ці Дрэздэн. Рэпертуар прыватнаўласніцкіх оперна-балетных тэатраў складаўся ў асноўным з твораў камедыйнага жанру, такіх як опера-буф, французская камічная опера. Оперны і драматычны рэпертуары былі на італьянскай, французскай і нямецкай мовах, некаторая частка перакладалася на польскую.

Для пастановак оперных і балетных спектакляў у беларускія гарады і мястэчкі па запрашэнні магнатаў прыязджалі вядомыя заходнееўрапейскія спевакі, інструменталісты, дырыжоры, кампазітары, балетмайстры, прадстаўнікі знаных еўрапейскіх школ. У прыдворных тэатрах і аркестрах замежныя музыканты займалі пасады капельмайстраў і выканаўцаў-салістаў. У тэатры існаваў дастаткова прафесійны оперны калектыў, паколькі выкананне опер такіх мэтраў, як П. Мансіны (адзін са стваральнікаў камічнай оперы), А. Грэтры (з яго імем звязаны росквіт французскай камічнай оперы XVIII ст.), І. Хасэ (адзін з вядучых майстроў оперы-sesia) і інш., патрабавала ад вакалістаў майстэрства і добрай прафесійнай падрыхтоўкі. Да таго ж камічная опера мела вялікі склад выканаўцаў: адзін толькі аркестр складаўся з 25 музыкантаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Часта ў Свіслачы выступалі прафесійныя выканаўцы. Прыезды тэатральных труп – драматычных, оперных, балетных – прымяркоўваліся акурат да адкрыцця свіслацкіх кірмашоў. Усе прафэсійныя трупы В. Тышкевіч браў на сваё ўтрыманне, плаціў акцёрам грошы, лепшых узнагароджваў каштоўнымі падарункамі [2, с. 211].

На такіх умовах працавалі ў Свіслачы гарадзенская трупа Яна Шыманскага і артысты віленскага тэатра пад кіраўніцтвам Мацея Кажынскага. Гэта былі змешаныя оперна-драматычныя трупы, у якіх тыя самыя акцёры ігралі і ў оперы, і ў драме, і ў камедыі. Акрамя аўстра-нямецкай, італьянскай, французскай тэатральных школ, у свіслацкім тэатры, па сведчанні А. Мілера, у пачатку XIX ст. была добра прадстаўлена польская школа: сюды прыязджалі варшаўскія славутасці з «Teatra Narodowego» – І. Вяроўскі, Банавентура Кудліч і інш. [3].

Капельмайстрам капэлы з 1788 г. па 1789 г. быў італьянец Карм'е Чыпрыяні – кампазітар, скрыпач і дырыжор, імя якога было ўжо досыць вядома ў Беларусі. У 1775 г. ён быў запрошаны князем Сапегам у Ружаны на пасаду капельмайстра. Пад кіраўніцтвам К. Чыпрыяні ружанская капэла дасягнула высокага прафесійнага ўзроўню. У верасні 1776 г. яго запрасіў да сябе ў Слонім у якасці скрыпача-саліста гетман Міхал Казімір Агіньскі. Пасля К. Чыпрыяні быў запрошаны В. Тышкевічам для камплектавання свіслацкай капэлы [6, с. 17].

Разам з замежнымі музыкантамі, прадстаўнікамі розных еўрапейскіх школ, у прыватных тэатрах і капэлах Беларусі служылі мясцовыя інструменталісты і вакалісты, так званыя «вольныя» – выхадцы з мяшчанства і збяднелай шляхты, якія працавалі паводле кантрактаў, і прыгонныя музыкі. Цалкам магчыма, што ў Свіслачы, як і ў іншых мястэчках Беларусі, пры тэатры была школа, у якой замежныя, а пазней і мясцовыя педагогі рыхтавалі вакалістаў, музыкантаў, танцораў і акцёраў з ліку дзяцей прыгонных, бедных мяшчан, дробнай шляхты для свіслацкай сцэны. Прайшоўшы навучанне ў такіх школах, папрацаваўшы разам з вядомымі еўрапейскімі майстрамі ў балетных, оперных калектывах, гэтыя танцоры, спевакі, музыканты набывалі належныя прафесійныя ўменні і навыкі.

У «культурную праграму», якая прапаноўвалася гасцям В. Тышкевіча, уваходзілі і забавы ў парку, дзе месціўся імпра-візаваны летні тэатр пад адкрытым небам. Такі ж тэатр быў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і ў маёнтку «Сымфаны», пабудаваным В. Тышкевічам для Марыі Тэрэзы. У тэатры ставіліся сцэны з айчыннай гісторыі, на міфалагічныя і біблейскія сюжэты. Па ўспамінах Л. Патоцкага:

*«Пасля багатага абеду ўсе накіраваліся ў парк. Прайшоўшы ліпаваю вуліцаю і паглыбляючыся штораз далей, у вузкім пераходзе паміж дзвюма сценамі старажытных шпалераў сустрэлі крэслы, пастаўленыя радамі. Павешаная ў самай глыбіні заслона казала пра схаваную неспадзяванку. А што за яна будзе, адгадаць было цяжка. Як толькі кожны заняў месца, на пададзены знак заслона ўзнялася, і паміж дрэваў усе ўбачылі старца, які сядзеў на кургане з дзёрну. Белыя валасы спадалі яму на плечы, белая барада апускалася на грудзі. На ім – блакітны ўбор, падпяразаны залатым шнурам. Гэта Асіян, князь скандынаўскай зямлі. У руках трымаў лютню. Падыгрываючы на ёй, апяваў рыцарскія подзвігі, славу і няшчасці сваёй айчыны: “Песні мае! паўтарыце даўней што было. /*
*І ты аджыві ў іх, асілкаў былых хвала!” < ...>*

*Глыб сцэны адкрываецца. Узброеныя караблі з распушчанымі ветразямі, з разгорнутымі шматкалёрнымі флагамі пад гукі ваеннай музыкі адплываюць ад прыстані. На адным з іх стаіць рыцар у залацістай зброі і шышаку, глядзіць у той бок, дзе асталіся бацька, жонка, родная зямля. І калі Аскар, сын Асіяна, пашле апошняе развітанне прыгожай Мальвіне, калі тая ловіць яго позіркам, выцягвае за ім рукі, караблі, аднесеныя плынню вады, хутка аддаляюцца, знікаюць у прасторы, музыка заціхае, заслона апускаецца»* [2].

Прадстаўленне звычайна заканчвалася ўрачыстай вячэрай у свіслацкім палацы. Пасля вячэры пачыналіся танцы, якія цягнуліся без перапынку да самай раніцы. Часцей за ўсё на балях і маскарадах выконваліся заходнееўрапейскія і польскія (мазурка, паланэз) танцы [6, с. 18].

Пасля адкрыцця ў 1805 г. знакамітай Свіслацкай гімназіі пачаў дзейнічаць яшчэ і школьны тэатр, у якім сіламі навучэнцаў ставіліся п’есы, прымеркаваныя да свята 29 чэрвеня – заканчэння навучальнага года ў гімназіі. Вось як апісвае адно з такіх пастановак Л. Патоцкі: *«Пад расцягнутым багатым шатром спачываў на ложы Канстанцін Астрожскі. Ён быў накрыты буркаю, навокал быў развешаны вайсковы рыштунак: зброя, шчыт, меч, коп’і, булава, харугвы – гетманская і здабытая ў непрыяцеля. Побач сядзела дачка. Малады збраяносец каля ног,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*падыгрываючы на ліры, спяваў вядомую думу Ю. Нямцэвіча пра перамогу пад Оршаю»* [2].

Вядома, што створаны В. Тышкевічам тэатр працягваў існаваць у Свіслачы яшчэ ў 20–30-х гг. XX ст. Дзейнасць яго была адноўлена вучнямі мясцовай настаўніцкай семінарыі. На той час у ім ставіліся больш сучасныя аўтары: «Блажэк апантаны» і «Яселек» У. Анчыца, «Варшавянка» С. Выспяньскага і інш. Дэкарацыямі займаўся прафесар Павал Бялэк з вучнямі. Выступленні семінарыстаў наведвалі нават жыхары, пераважна мясцовыя яўрэі [3].

Пры семінарыі існаваў свой аркестр, якім кіраваў Банецкі, а пасля яго Леанард Хільман і Эдуард Гойлік – пазней вядомы кампазітар, прафесар вышэйшай школы ў Беластоку. Аркестр іграў на ўсіх галоўных мерапрыемствах у семінарыі і мястэчку: на выступленні вучнёўскай дружыны скаўтаў, жалобны марш Ф. Шапэна на пахаваннях былога дырэктара семінарыі Баляслава Борыса і грамадскага дзеяча Свіслачы аптэкара Яна Стралкоўскага [3].

Прыведзеныя сведчанні культурнага жыцця Свіслачы пачатку XIX ст., па сутнасці, былі тыповымі для многіх беларускіх мястэчак Заходняга рэгіёну ў акрэслены пэрыяд, а прыдворныя тэатры былі культурна-асветным асяродкам. Гэтаму спрыяла арыентацыя тагачаснай эліты на асветны ідэал і культурныя завядзёнкі Заходняй Еўропы, дзе адной з прэстыжных формаў баўлення вольнага часу прывілеяваным саслоўем з'яўляўся акурат тэатр, наведванне якога пры ўсім тым рабілася нагодай для дэманстрацыі модных строяў, наладжвання свецкіх кантактаў.

1. *Барышаў, Г.* Маёнткавыя прыгонныя тэатры // Гісторыя беларускага тэатра: у 3 т. (4 кн.). – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 1987. – Т. 1. Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917. – 1983. – 496 с.

2. *Патоцкі, Л.* Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі ; укл., прадм., камент А. М. Філатавай ; пер. з пол. І. У. Саламевіча. – Мінск : Полымя, 1997. – 207 с.

3. *Раманаў, С.* Феномен шматкультурнасці мястэчка Свіслач (XIX – першая палова XX ст.) // Працэсы ўрбанізацыі ў Беларусі : XIX – пачатак XXI ст. : зб. навук. арт. – Гродна : ГрДУ, 2010. – С. 283–294.

4. Свіслацкі тэатр Тышкевіча // Тэатральная Беларусь : энцыкл. – Мінск : БелЭн, 2003. – С. 336–337.

5. *Соркіна, І. В.* Мястэчка Свіслач у першай палове XIX ст. // Старонкі гісторыі Свіслацкага краю : матэрыялы навук.-практ. краязнаўчай канф. / Гродзен. дзярж. ун-т. – Гродна, 2001. – С. 48–61.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. *Чуланава, І. У.* Музычна-тэатральная культура Свіслачы канца XVIII – першай паловы XIX ст // Ваўкавышчына: краязнаўчы часопіс. – Ваўкавыск. – 2009. – № 5 (15). – С. 16–18.
7. *Miller, A.* Teatr Polski i muzyka na Litwe jako strażnice kultury Zachodu (1745 – 1865) / A. Miller. – Wilno, 1936.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ